НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь, твой народ дачакаецца Залацістага, яснага дня!*
*М. Багдановіч.*

№ 3 (115), САКАВІК 2011 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

## ПОГЛЯД РЭДАКТАРА

# ЭВАЛЮЦЫЙНЫ ДЫЯЛОГ НЕМАГЧЫМЫ

На днях Аляксандр Лукашэнка даў трохгадзіннае інтэрвію ўплывоваму амерыканскаму выданню Washington Post. Падчас размовы з амерыканскай журналісткай Элізабет Уэймаўт кіраўнік краіны зрабіў шэраг правакацыйных заяў, якія выклікалі неадназначную рэакцыю як на Беларусі, так і на Захадзе. У прыватнасці, ён абвінавачаў некаторыя краіны Еўропы і ЗША ў тым, што яны нібыта хацелі ўчыніць на Беларусі антыдзяржаўны пераварот. Значна большыя фрагменты інтэрвію былі паказаны на дзяржаўным тэлеканале БТ, аднак многія істотныя моманты адсутнічалі. Было заўважана, што амерыканская журналістка вельмі нядрэнна падрыхтавалася да інтервію і здолела некалькі разоў падлавіць "бацьку" на хлусні. Лукашэнка зрабіў выгляд, быццам бы не ведае, што ў зняволеных Ірыны Халіп і Андрэя Саннікава ёсць малы сын, таксама лукавіў, што спецназ каля дома Ураду нікога не збіваў. Ён абазваў партыю хрысціянскіх дэмакратаў "бандытамі", абвінаваціў амерыканскага амбасадара ў стварэнні "пятай калоны", нагаварыў, што быў у США аж пяць разоў і "пабываў у розных кропках з усходу на захад", і назваў Амерыку краінай з "дыктатарскім курсам". Увогуле, амерыканская журналістка была шакіравана недыпламатычнымі, хамаватымі і наўпрост агрэсіўнымі манерамі Лукашэнкі. Безумоўна, сярод амерыканскіх чытачоў інтэрвію з аўтакратычным лідэрам выклікае толькі адмоўную рэакцыю, у дэмакратычным грамадстве такія паводзіны цалкам непрымальныя. Але на жаль, Беларусь – краіна пакуль што несвабодная, таму для пэўнай часткі насельніцтва такія бацькавы шоу, як бальзам на рану. За 20 гадоў, якія мінулі пасля распаду Савецкага Саюзу, суседкі Беларусі сталі паспяховымі і заможнымі дэмакратычнымі краінамі. Але ж насамрэч самотна ад таго, што калі Эстонія, Латвія і Літва разарвалі ланцугі савецкай тыраніі і далучыліся да інстытуцый еўраатлантычнай цывілізацыі – Еўразвязу і НАТО, у той час як Беларусь засталася ззаду. Адыёзны рэжым Аляксандра Лукашэнкі пры непасрэдным удзеле Крамля з дапамогай рэпрэсій і фальшаваных выбараў утрымлівае краіну ў дэспатычным рэжыме амаль два дзесяцігоддзі. І хаця ў інтэрвію с амерыканскай журналісткай кіраўнік РБ выдаў чарговае "пасланне Захаду", усё ж такі яно ператварылася ў піяр-акцыю, разлічаную на ўнутраную аўдыторыю. Чарговы раз Лукашэнка прадэманстраваў сваім вернападданым, што нічога не баіцца, ніхто не зможа яго "нахіліць": ні Захад, ні Усход. Ён адкінуў усе апошнія надзеі наіўных выбаршчыкаў на лібералізацыю і дэмакратызацыю, напомніў усяму цывілізаванаму свету, што мяняць курс не збіраецца. Пры гэтым метады яго кіраўніцтва становяцца ўсё больш жорсткімі і бесчалавечнымі. Нягледзячы на гэта, яго прыхільнікі проста ў захапленні ад таго, як Лукашэнка падчас інтэрвію вінаваціў і Амерыку, і асабіста журналістку Элізабет Уэймаўт ва ўсіх смяротных грахах. "Вось добра наш бацька адчытаў гэтых нягеглых амерыканцаў!" – думаюць яго калгаснікі і пенсіянеры. І аўтарытэт лідэра ў іх вачах яшчэ больш узняўся, а Лукашэнка атрымаў патрэбныя яму палітычныя дэвідэнды. Аддадзім ім належнае, няхай цешацца. Толькі дрэна, што яны не разумеюць, якім коштам Лукашэнка ўтрымлівае уладу. Шкада, што яны не заўважаюць, як загналі сваіх дзяцей і ўнукаў у даўгавую яму памерам у 28 мільярдаў даляраў. Так, несумненна, Амерыка з'яўляецца апірышчам дэмакратыі і забараніць свабодным журналістам браць інтервію ў аўтакратычных лідэраў немагчыма. Аднак многія эксперты, як беларускія, так і замежныя сцвярджаюць, што заходнія СМІ нагогул не павіны прадстаўляць трыбуну недэмакратычным кіраўнікам. У крайнім выпадку, адказнасць за яго наступствы кладзецца на самога журналіста. Бясспрэчна, журналіст мае права даць лідэру платформу для выказвання яго прапагандысцкіх поглядаў. Але тут трэба быць асабліва ўважлівым. Вядома, што з дэмагогамі спрачацца бессэнсоўна, таму што не прымаюць ніякай альтэрнатыўнай думкі. Неасавецкія метады кіравання краінай па-ранейшаму маюць вельмі вялікі ўплыў на народ. А гэтая гульня з Захадам ў свабоду слова выкарыстоўваецца рэжымам толькі для таго, каб надаць яму чалавечае аблічча, а яго кіраўнікам стварыць імідж прыстойных людзей. Не трэба забываць, што гульня будзе працягвацца да апошняга, але сам палітычны курс будзе даволі жорсткім.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## У ЦЭНТРЫ УВАГІ

# ПРАБЛЕМЫ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ

Асноўная мэта дзяржаўнай палітыкі цяперашняй улады – захаванне стабільнасці ў сацыяльна-працоўнай сферы. На наступнае пяцігоддзе запланавана мадэрнізацыя эканомікі, пераход на больш высокі тэхналагічны ўклад. Безумоўна, ва ўмовах структурных змяненняў размова ідзе аб забяспячэнні не толькі поўнай, але і эканамічна эфектыўнай занятасці з больш высокай прадукцыйнасцю працы, дастойнай аплатай і ўмовамі працы. Ці рэальна выкананне такіх глабальных планаў пры цяперашняй уладзе? Насамрэч для павышэння эфектыўнасці выкарыстання працоўных рэсурсаў і фарміравання кадравага патэнцыялу, спрыяння сацыяльнай стабільнасці неабходны адпаведныя умовы. Як вядома, усе плануемыя мерапрыемствы рэалізацыі дзяржаўных і рэгіянальных праграм фінансуюцца менавіта з таго ж дзяржаўнага бюджэту. А для таго, каб адбывалася развіццё малых гарадоў, не скарачалася колькасць рабочых месцаў, на поўніцу забяспечваліся патрэбы ў сацыяльнай абароне насельніцтва, неабходна выканаць усе прагнозныя паказчыкі бюджэту. Без гэтага немагчыма рухацца наперад, тым больш забяспечыць дабрабыт насельніцтва. На працягу апошніх гадоў прыярытэты бюджэту Шумілінскага раёна, бадай што, прынцыпова не зміняюцца. Аналіз прагнозных паказчыкаў паказаў, як штогод захоўваецца скіраванасць бюджэту на сацыяльную сферу. У 2011 годзе больш за 75, 8% сродкаў да агульнага аб'ёму расходаў бюджэту раёна плануецца выдзеліць на сацыяльныя патрэбы. Для параўнання: у 2010 годзе было 66% , а ў 2009 – 69%. Як бачна, назіраецца тэндэнцыя да павелічэння. Прычым у гэтым годзе самая важкая частка сацыяльных расходаў будзе патрачана на ўтрыманне сістэмы адукацыі – 23545,6 мільёнаў рублёў. На сённяшні дзень у раёне 24 школы і 13 дзіцячых садкоў, у якіх вучацца і выхоўваюцца звыш трох тысяч дзяцей. Намечана значнае павелічэнне – на 30% больш сродкаў будзе выдзелена для медыкаў. Усяго на ахову здароўя ў гэтым годзе будзе накіравана 12463,7 мільёна рублёў. Але ўсё ж гэта ўдвая менш, чым на адукацыю. На гэтыя грошы будуць утрымлівацца цэнтральная райбальніца, дзве ўчастковыя бальніцы і 16 ФАПаў. Культура атрымае ўсяго 3789,1 мільёна рублёў. Не ўсцешваюць прагнозныя паказчыкі ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы, на якую пайшло 8094,5 мільёнаў рублёў. У бягучым годзе аб'ём сродкаў з раённага бюджэту скараціўся на 24% да ўзроўня 2010 года. Таму прадугледжана субсідыя да 45% затрат камунгаса па аказваемых насельніцтву паслугах ( у мінулым годзе было 43%). Нямнога, калі ўлічваць рост цэнаў і зрабіць папраўку на інфляцыю. Выходзіць, што падтрымання аб'ектаў камунальнай гаспадаркі ў спраўным стане трэба шукаць пазабюджэтныя крыніцы фінансавання. Увогуле, нягледзячы на аптымістычныя працэнты сацыяльнага накірунку, намінальны аб'ём падзення прагнозных паказчыкаў раённага бюджэту навідавоку. Мяркуйце самі: на бягучы 2011 год бюджэт па даходах і расходах плануецца ў суме 62075,2 мільёны рублёў. А ў мінулым 2010 годзе было 660485 мільёна рублёў. Акрамя таго, назіраецца скарачэнне колькасці працаздольнага насельніцтва, як па ўсёй Беларусі, так і па нашаму раёну. І хаця афіцыйныя дадзеныя сведчаць аб 1,5 працэнтах беспрацоўя, дык гэта далёка не так. Не сакрэт, што амаль трэць пражываючых у раёне працаздольных людзей працуюць за межамі раёна, а многія наогул з'ехалі на працу ў суседнія краіны, пакінуўшы свае сем'і ў Шуміліне. Сярэдняя зарплата таксама занадта сціплая. Сярэдні паказчык па Беларусі ў сельскай гаспадарцы паводле Нацыянальнага статыстычнага камітэта 952,4 тыс. На Шумілінншчыне ў лепшым выпадку крыху больш мільёна атрымліваюць толькі будаўнікі, ды і тыя – начальнікі. На сельгаспрадпрыемствах раёна сярэдні заробак дасягае не болей за 500-600 тысяч рублёў. Шырока разрэкламаваныя ўладамі перад выбарамі абяцанні заробкаў у 500 даляраў праваліліся, рэальныя лічбы засталіся на мяжы каля 200 даляраў. Дык хто тады напоўніць раённую казну?

**Алесь Шумскі.**

## "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

## НАШЫ ЗЕМЛЯКІ

# Новы твор краязнаўцы

В. В. Улюценку ў Шуміліне ведаюць у раёне як вопытнага ўрача, які шмат гадоў адпрацаваў у райбальніцы. А яшчэ Віктар Васільевіч ( творчы псеўданім Антон Параскевін ) вядомы шумілінцам як даследчык роднага краю з 40-гадовым стажам. Ён даследаваў гісторыю прамбыткамбіната, Шумілінскага вакзала, шукаў у архівах матэрыялы, каб даведацца аб трагедыі, звязанай з Халакостам ў Сіроціне – усяго напісана больш за 70 прац краязнаўчага характару. Многія краязнаўчыя даследванні яго ажыццяўляе хрысціянства – на тым падмурку, без якога не маглі абыйсціся нашы продкі.Хіба ў даўніну людзі маглі жыць без царквы? Нездарма за некалькі публікацый Віктар Улюценка атрымаў падзячны ліст ад уладыкі Філарэта. Самабытны талент нашага земляка быў высока ацэнены і за межамі раёна. У свае рады яго прыняў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Менавіта з пад пяра нястомнага шумілінскага краязнаўцы выйшла кніга "Светлазор: Сказы, Вершы, Апавяданні. Песні." Дарэчы, нядаўна Віктар Улюценка напісаў новую песню. Песня называецца "Казак". Не сакрэт, што наш краязнаўца мае казацкія карані і ўжо пісаў газетныя публікацыі на гістарычную тэму, прысвечаную лёсам казацкіх сямей. На гэты раз Віктар Васільевіч напісаў не толькі тэкст песні, але і музыку.З дапамогай гарадскога Дома культуры песня ўжо запісана на дыск і слухачы змогуць яе пачуць на раённым радыё.

**С. Горкі.**

## АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бясплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

## ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# Самая вялікая запазычанасць

У сённяшні час немагчыма ўявіць наша жыццё без развітай сістэмы бытавога і жыллёва-камунальнага абслугоўвання. Прычым ад добрасумленнай працы камунальнікаў у многім залежыць знешні выгляд населеных пунктаў, утульнасць і парадак у доме, камфортныя ўмовы пражывання кожнага жыхара нашага раёна. Вырашаючы шматлікія і складаныя задачы, работнікі камунгасу спалучаюць свае камерцыйныя інтарэсы з сацыяльнымі інтарэсамі грамадзян. Гэты адносіны паміж сферай паслуг і спажыўцом непарыўна звязаны з забяспячэннем абароны правоў спажыўцоў камунальных паслуг на заканадаўчым узроўні. Сёння грамадзянін не павінен быць просьбітам у чыноўніка, чалавеку трэба аддаваць больш увагі. Тым не менш, у Шумілінскім раёне застаецца даволі значны колькасць зваротаў – 12,3 звароты на 100 асабістых рахункаў. Усяго на абслугоўванні камунгаса знаходзіцца 8350 асабовых рахункаў. Між тым, як паказваюць аналіз зваротаў і сацыялагічныя апытанні насельніцтва, сфера паслуг ЖКГ працягвае заставацца адной з самых надзённых праблем. Тым больш, што шумілінская жыллёва-камунальная гаспадарка адна з буйнейшых у вобласці сярод раёнаў. І нават калі народная гаспадарка ў нас развівалася больш-менш рытмічна, без збояў, у гэтай галіне заўсёды знаходзіліся праблемы. Дарэчы, паводле афіцыйных дадзеных, шумілінскі камунгас на 1 студзеня мае і самую высокую ў вобласці дэбіторскую запазычанасць. Са свайго боку сельгаспрадпрыемствы нашага раёна завінаваціліся камунальнікам 3,4 мільярды рублёў. Як высветлілася, калгасы і саўгасы дагэтуль не пералічылі грошы за ваду. Дзякуючы строгім мерам, даволі значна зменшылася колькасць даўжнікоў сярод насельніцтва. Калі ў мінулым годзе неплацельшчыкі былі вінаватыя 292 мільёны рублёў, то ў бягучым годзе ўжо 185. Многае, калі не ўсё, залежыць ад кіраўніка арганізацыі. Пэўны час нават існавала практыка, калі кіраўніка трэба было панізіць на пасадзе альбо, наадварот, правераць арганізатарскія здольнасці, яго кідалі "на прарыў" у камунальную сферу. Тут нічога не схаваеш ад людзей, і нават пры дастатковай колькасці матэрыялаў, час ад часу высвечваюцца "вузкія" месцы: яміна ў асфальце, труба, якая працякае, непрыбраныя тратуары. Не так даўно на пасаду дырэктара камунгасу быў прызначаны В. Коўзан. Як і ўсе кіраўнікі, ён павінен быць даступным для ўсіх катэгорый людзей. Прынамсі, каб палепшыць сітуацыю са зваротамі людзей, кіраўнік камунальнай службы не можа сядзець і чакаць, пакуль грамадзянін сам праявіць ініцыятыву. Да таго ж за недахопы ў рабоце са зваротамі грамадзян чыноўнік рызыкуе быць пакараным. Таму дырэктар імкнецца перахапіць ініцыятыву ў спажыўцоў, каб не парушыць іх правы. Як бы там ні было, але на адрас камунальнікаў паступіла 183 звароты, з іх 45 пайшлі ў вышэйшыя арганізацыі, прыняты меры па 122 заявах. Выходзіць так, што па 45 пісьмовым зваротам вялася безвынiковая перапіска, калі людзі вымушаны былі звярнуцца ў вышэйстаячыя органы. Чалавек можа дайсці да сталіцы, зварот зарэгіструюць, вяртаюць да мясцовай камунальнай службы, і нявырашанае пытанне зноў разглядаюць. Зрэшты, такая гісторыя здарылася ў пазамінулым годзе з жыхарамі вёскі Амбросавічы, якія цэлы год вялі перапіску з камунгасам наконт газіфікацыі і ацяплення шасці двухпавярховак. І справа зрушылася з месца толькі тады, калі скаргі ўжо дайшлі да адміністрацыі прэзідэнта і дэпутата "Палаткі" Васіля Байкова. Разам з тым, аналіз зваротаў паказвае, што шэраг грамадзян жадаюць вырашыць свае праблемы, звяртаючыся не па адрасу. Напрыклад, па 46 зваротах былі дадзены тлумачэнні, у 3 выпадках адмоўлена. Акрамя таго, ёсць такая катэгорыя скаржнікаў, якіх цікавіць любая сацыяльная праблема, дзе магчыма коштам яе вырашэння напрацаваць сабе пэўны імідж, або скінуць на чыноўніка свой эмацыйны стрэс. І гэта нармальна, таму што разабрацца ў законах і ва ўсіх складанасцях жыллёва-камунальнай сістэмы простаму абывацелю немагчыма, ды і няма патрэбы. У такіх выпадках у раёне павінна быць грамадская прыёмная, куды чалавек мог бы пайсці, дзе яму дапамаглі б граматна напісаць заяву і адправіць у адпаведную інстанцыю. Праўда, ёсць яшчэ інфармацыйна-прапагандысцкія групы з чыноўнікаў, якія раз'язджаюць па раёну. Але найчасцей такія мерапрыемствы праводзяцца дзеля "галачкі", каб апраўдаць існаванне штатных прапагандыстаў. На жаль, у вёсках зусім не праводзяца сходы кватэраздымшчыкаў з удзелам начальнікаў спецыялістаў УП ЖКГ. Мабыць, камунальнікі добра ведаюць, як шмат набалелых пытанняў дзесяцігоддзямі накапілася ў вясковых жыхароў. Але казаць, што камунгас ухіляецца ад вырашэння запушчаных праблем таксама было б несправядліва. Каб аказваць спажыўцам неабходны мінімум паслуг, прадпрыемству было патрэбна 8,9 мільярда рублёў на першы квартал. Аднак сабраць неабходную суму грошай пакуль што не ўдалося. Пры ўсім тым, што работнікам камунгаса прапануюць зверху вучыцца працаваць і ва ўмовах дэфіцыту матэрыялаў ды яшчэ аператыўна рэагаваць на скаргі і прапановы жыхароў нашага раёна.

**Алесь Шумскі.**

## КРЫМІНАЛ

### ПАКВАПІЛАСЯ НА ГРОШЫ

Пасля наведвання кватэры малазнаёмай пенсіянеркі, 1950 года нараджэння, грамадзянка В. скрала 87 тысяч рублёў. Супрацоўнікамі Шумілінскага РАУС устаноўлена, што ліхадзейка ўжо была раней судзімая па артыкулу 174 ч. 3. Скрадзеныя грошы канфіскаваны.

### ЖЫХАР ШУМІЛІНА АБРАБАВАЎ ЦАРКВУ

З заявай у міліцыю звярнуўся настаяцель храма. Як высветлілася, 26 студзеня невядомы зламыснік разбіў аконнае шкло і пранік унутр будынка.З царквы ён выкраў мельхіёравы ланцужок, дзве іконы. Нанесены ўрон склаў 963 тыс. рублёў. Супрацоўнікамі РАУС устаноўлена, што злачынства ўчыніў непрацуючы, раней судзімы мясцовы жыхар. Супраць яго распачата крымінальная справа па арт. 205 ч.2 Крымінальнага кодэкса (крадзёж).

### ВЫРАТАВАЎ ЛЮДЗЕЙ

Вадзіцель пажарна-аварыйна-выратавальнага паста Сяргей Марозаў вынес з агню 5-гадовую дзяўчынку і яе бабулю.

Быў звычайны суботні вечар. Сяргей адпачываў дома пасля чарговага дзяжурства. Ненаўгога выйшаў на вуліцу, заўважыў густы дым у суседнім завулку і вырашыў высветліць прычыну. На сваім уласным легкавіку пад'ехаў бліжэй на месца здарэння: ужо гарэў дах дома. У дзвары нікога не было, але Сяргей ведаў, што ў доме могуць знаходзіцца людзі. Вырашыў праверыць свае падазрэнні, папрасіў суседа выклікаць пажарнікаў па тэлефоне, а сам закрыў твар курткай і зайшоў у палаючую пабудову. Унутры ўсё было задымлена – гарэлі сцены, столь, хатняя маёмасць. Стаў крычаць, ці ёсць хто ў хаце і пачуў голас дзіцяці, якое звала на дапамогу. Знайшоў у адным з пакояў маленькую дзяўчынку, схапіў на рукі і вынес на вуліцу. Дзяўчынка сказала, што ў хаце засталася яе бабуля. Выйсці на вуліцу яны не змаглі, таму што выхад быў перакрыты агнём. Выратавальнік зноў кінуўся ў дом і сапраўды знайшоў там 76-гадовую пенсіянерку. На шчасце, нікога не прыйшлося нават адпраўляць у шпіталь. Як пазней аказалася, пажар пачаўся з-за няспраўнай печы – шчылін у коміне. Не кожны чалавек змог бы адважыцца ўвайсці ў палаючы дом і ратаваць людзей. Мужны ўчынак Сяргея Марозава выклікае павагу. Ратаваць людзей для яго не проста прафесія, а прызванне.

## КНІГА СКАРГАЎ

# ПАЖАДАННІ ПАКУПНІКОЎ

Безумоўна, спажывецкая крама на вёсцы цяпер можа прапанаваць усё неабходнае, што патрэбна вясковаму чалавеку. Складана сабе ўявіць нават невялікую вёску без гандлёвай кропкі. А сельскі прадавец для сяльчан не проста чалавек, які займаецца аперацыяй па куплі-продажу, а нешта большае. Вясковы народ – гаваркі, адкрыты, усе адзін пра аднаго ўсё ведаюць. Людзі жадаюць адчуць павагу да іх, і набыць давер да чалавека, які іх абслугоўвае. Таму прадавец павінен умець наладжваць кантакты з людзьмі і да кожнага мець свой асабісты падыход. Кепска, калі давер не набыты, або па нейкіх абставінах страчаны. Многія крамы Шумілінскага райспажыўтаварыства забяспечаны сучасным халадзільным абсталяваннем. Менавіта такія ўмовы працы гандлёвых кропак на вёсках дазваляюць прадаваць больш шырокі асартымент малочных, мясных і рыбных вырабаў. Прадукцыю дастаўляюць па меры рэалізацыіі. Сялянам няма патрэбы ездзіць у райцэнтр Шуміліна па неабходныя пакупкі. Гэта бачна па ў напалову пустых прыгарадных аўтобусах. Самыя маленькія населеныя пункты абслугоўваюцца аўталаўкамі. Шафёры-прадаўцы добра ведаюць сваіх кліентаў, самі на месцы вывучаюць іх попыт і стараюцца задавальняць. Апроч таго, прамысловую групу тавараў дастаўляюць са склада-магазіна райпа і ўнівермага па заяўках насельніцтва. Жадаючыя могуць набыць цераз сельскі магазін бытавую тэхніку: тэлевізар, халадзільнік, пральную машыну. Калі не хапае грошай, можна аформіць крэдыты. Як запэўніваюць у райспажыўтаварыстве, таварамі першай неабходнасці вяскоўцы заўсёды забяспечаны. Але гэта не зусім так. З пачатку сакавіка ў нашу рэдакцыю паступіла ўжо чатыры ананімных званкі ад пакупнікоў: два з вёскі Амбросавічы, адзін з вёскі Пісарава і адзін з пасёлка Прыазёрны. Як вядома, вяскоўцы не вельмі любяць "свяцiцца" таму і свае нараканні на работу шумілінскага гандлю выказваюць у такой сціплай форме. І сапраўды, наведаўшы крамы па слядах скаргаў, многія факты падцвердзіліся. Жанчыны з Амбросавіч расказалі, што ў мясцовай краме ўжо два тыдні няма грэчкі. Яны пакутуюць на цукровы дыябет, а грэчка – гэта самы незаменны дыетычны прадукт пры такой сур'езнай хваробе. Грамадзянін В. з Пісарава паведаміў, што ў магазіне вёскі Дабея бедны асартымент каўбасных вырабаў, няма маргарыну, тлушчу і алею. Магазін у вёсцы Прыазёрны наогул быў некалькі дзён зачынены. Амаль усе людзі скардзіліся на дрэнна наладжаны прыём шклотары. Бутэлькі чамусьці прымаюць толькі раз у тыдзень. За тлумачэннямі давялося звярнуцца да кіраўніцтва райспажыўтаварыства. Па словах намесніка начальніка Шумілінскага райпо Л. Дзегцярэнкі, прадукты будуць завезены ў бліжэйшы час. Бутэлькі нібыта прымаюць кожны дзень, але пры наяўнасці дастатковай колькасці тары. З прадаўцамі пытанне больш праблематычнае: вострастаіць праблема кадраў. Заробкі невысокія, а праца нялёгкая, таму бывае вельмі няпроста знайсці работнікаў у вясковы магазін. Будзем спадзявацца, што ў бліжэйшы час сітуацыя выправіцца да лепшага. Не трэба забываць, што гандаль – самая неабходная паслуга для вяскоўцаў. Абыякавасць да попыту пакупніка дорага каштуе, таму яе не павінна быць.

**Алесь Прыбярэжны.**

## НАША СПАДЧЫНА

# МЯСЦОВЫЯ АБРАДЫ

Нацыянальныя абрады традыцыі і абрады, без перабольшвання, можна назваць вечнымі, надзейнымі і, нарэшце, прыгожымі арыенцірамі ў жыцці чалавецтва. Па іх выхавана не адно пакаленне людзей, яны ўзбагачаюць нашу душу, сэрца, побыт. Старажытныя абрады дапамагаюць насельніцтву займець сваю спадчыну, захаваць і развіваць народнае мастацтва. Здаўна павялося і святкаванне Масленіцы ў нашым райцэнтры. Увогуле, шырока і разгульна ладзяць шумілінцы провады зімы па ўсяму раёну. У гэты дзень спальваюць пудзіла зімы, водзяць карагоды, варожаць на блінах, просяць адзін у аднаго прабачэння. У першую суботу сакавіка ў паветры ўжо запахла сапраўднай вясной. У такі дзень грэх сядзець дома, таму шумілінцы ахвотна падцягваліся да таго месца, дзе праходзіла святочнае мерапрыемства. Самадзейныя артысты далі гледачам цікавы канцэрт,а работнікі культуры арганізавалі цікавыя конкурсы і гульні. Бойка ішоў гандаль ля палатак райспажыўтаварыства. Як здаўна жартавалі беларусы – нават і падмазку з'еў, што трапілася з блінцом. Сёлета клуб народнай кухні "Разынка" прапаноўваў бліны з рознымі начыненнямі : са смятанай і маслам, варэннем і мёдам, тварагом і сырам. А на гарадскім стадыёне разгарнуліся спаборніцтвы. Можна было паўдзельнічаць у лыжнай эстафеце, мужчыны спрабавалі свае сілы ў падняцці гіры і перацягванні каната. Многіх зацікавіў мініфутбол на снезе. А ў снежнай гурбе красавалася, чакаючы свайго зорнага часу, пудзіла-Маслёнка.

**Алесь Прыбярэжны.**

# ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ ДАПАМОЖНІК

У школах нашага раёна вучні цяпер карыстаюцца новым дапаможнікам пад назвай "Наша Шумілінщына". Матэрыялы для гісторыка-краязнаўчага курса "Шуміліназдаўства" рыхтавалі раённыя гісторыкі і географы, краязнаўцы і біёлаг. Каб лепш вывучыць гісторыяграфію роднага краю, школьнікі на факультатыўных занятках і гістарычных гуртках знаёмяцца з найбольш важнымі падзеямі ад старажытнасці і да навейшага часу.

## ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# Евросоюз введет санкции против финансистов Лукашенко

ЕС ГОТОВИТСЯ РАСШИРИТЬ САНКЦИИ ПРОТИВ БЕЛАРУСИ. ОНИ ДОЛЖНЫ ЗАТРОНУТЬ ЛИЦ, КОТОРЫЕ, КАК ПРЕДПОЛАГАЕТСЯ, ПЕРЕВОДЯТ ДОХОДЫ НЕФТЯНЫХ КОМПАНИЙ «БЕЛНЕФТЕХИМ» И «ТРАЙПЛ», ПРОИЗВОДИТЕЛЕЙ ВООРУЖЕНИЙ «БЕЛТЕХЭКСПОРТ» И КАЛИЙНЫХ МИНЕРАЛЬНЫХ УДОБРЕНИЙ «БЕЛАРУСЬКАЛИЙ» В КАРМАНЫ ГОСЧИНОВНИКОВ.

Новые санкции нацелены на госбюджет и личный доход президента, но не должны нанести удар по экономике Беларуси или европейским компаниям в Латвии, Литве, Нидерландах и Польше, сообщает издание EUobserver (перевод – charter97.org).

Санкции должны затронуть лиц, которые, как предполагается, переводят доходы нефтяных компаний «Белнефтехим» и «Трайпл», производителей вооружений «Белтехэкспорт» и калийных минеральных удобрений «Беларуськалий» в карманы госчиновников.

Новый пакет санкций разрабатывается посольствами стран ЕС в Минске и дипломатами среднего уровня в Брюсселе. Ожидается, что он будет одобрен в апреле министрами иностранных дел ЕС.

Кроме этого, Евросоюз готовится исправить уже существующий список из 160 чиновников, которым запрещен въезд в ЕС и чьи счета были заморожены в январе.

Первоначальный список включал одного умершего судью, а фамилия другого судьи упоминалась дважды. Также в список лиц, чьи счета должны быть заморожены, не вошел бывший министр внутренних дел Юрий Сиваков, обвиняемый в убийстве четырех оппозиционеров и отмывании денег для высокопоставленный чиновников.

Отсутствие его имени в списке вызвало разговоры о теории заговора в Минске.

Независимый журналист, пожелавший остаться анонимным, сообщил, что Великобритания и США не включили Сивакова в список, чтобы заставить Лукашенко думать, что он является агентом Запада. Европейские дипломаты объясняют случившиеся технической ошибкой. «Евросоюз не ведет психологической войны», — заявил один из дипломатов.

Говорят, что Сивакову, которому 65 лет, злоупотребляет алкоголем и является членом клуба ветеранов КГБ «Честь».

Бывший посол США в Беларуси говорит, что «Честь» отмывала по 1.5 миллионов долларов в день для Лукашенко и его окружения через банки в Польше, России и США. Но Сиваков, который возглавлял «Честь» в 2006 году, кажется, уже не ведет активной деятельности.

# МОЖНА ДАПАМАГЧЫ АСУДЖАНЫМ САЛІДАРНАСЬЦЮ

**Сяргей Абламейка**

**Суд Фрунзенскага раёну Менску асудзіў удзельнікаў Плошчы Аляксандра Атрошчанкава да 4 гадоў пазбаўленьня волі, Зьмітра Новіка да трох з паловай гадоў, а Аляксандра Малчанава да 3 гадоў. Усе трое будуць адпраўленыя ў калёнії ўзмоцненага рэжыму. Прысуды камэнтуе госьця ранішняга эфіру – праваабаронца, былая палітзьняволеная Эніра Браніцкая.**

**Абламейка:** Як вы пракамэнтуеце тое, што адбываецца ў апошнія тыдні ў судзе Фрунзенскага раёну Менску? Я маю на ўвазе і ранейшы прысуд Васілю Парфянкову, і ўчорашнія тры прысуды?

**Браніцкая:** Перш за ўсё я скажу, што гэта проста палітычныя перасьлед тых людзей, якія не пабаяліся выйсьці 19 сьнежня на Плошчу і сказаць што яны супраць. У дзеяньнях хлопцаў – як Васіля Парфянкова, так і трох астатніх – няма складу злачынства «масавыя беспарадкі». Магчыма, хуліганства, магчыма, пашкоджаньне маёмасьці, але наогул – гэта проста ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве. Спачатку Васілю Парфянкову далі 4 гады, у той момант не было з чым параўнаць – гэта быў жах. Але тое, што адбылося пазаўчора і ўчора ў судзе Фрунзенскага раёну над Атрошчанкавым, Малчанавым і Новікам, я не магу назваць інакш, як юрыдычны абсурд і здзек з прававой сыстэмы. Бо прысуд насамрэч зьдзеклівы. Супраць Аляксандра Атрошчанкава ў справе не было наогул нічога. Аляксандар быў на Плошчы, ёсьць адно відэа, дзе ён стаіць у групе асобаў, ня ў першых шэрагах, на прыступках Дома Ўраду, ён усьміхаецца. Аляксандар усьміхаўся і на судзе. Яму і далі болей за ўсіх. Зьміцер Новік... Ёсьць кадар, як ён наносіць некалькі ўдараў, але няма ніякай шкоды ад яго дзеяньняў. Але Зьміцер казаў, што ён не з усім, што адбываецца ў карціне, згодны, што ён разумее, што ёсьць палітычныя рэпрэсіі. І яму далі тры з паловай гады. А Аляксандар Малчанаў прызнаў сваю віну, але не зусім зразумела ў чым. Зрэшты на яго матэрыялаў у справе болей за ўсіх – ён наносіў удары, таксама там ёсьць момант са зьняцьцем сьцяга з будынка КДБ. І ён атрымаў менш. Але як бы там не было – гэта палітычныя прысуды. Гэта расправа, гэта пакараньне за тое, што людзі не баяцца.

**Абламейка:** Вы сама была ў ролі палітзьняволенай. Што можа зрабіць для асуджаных удзельнікаў Плошчы незалежнае беларускае грамадзтва?

**Браніцкая:** Патрэбная простыя падтрымка і салідарнасьць. Ім патрэбныя лісты, патрэбныя паштоўкі. У турму КДБ, дзе знаходзяцца Атрошчанкаў, Малчанаў і Новік, таксама можна дасылаць пасылкі. Патрэбная падтрымка іх сем'яў. Напрыклад, у Малчанава бацькі пэнсіянэры, хворай маці проста фізічна цяжка вазіць з Барысава передачы. У Новіка сям'я – маці, бабуля, малодшы брат – у Баранавічах, таксама ёсьць цяжкасьці з прыездам у Менск. У Васіля Парфянкова сям'я наогул не ўдзельнічае ў тым, што адбываецца ў яго жыцьці... Усе гэтыя сем'і цяпер разгубленыя, ім патрэбная маральная падтрымка.

## СВЕТ ПРА БЕЛАРУСЬ

# ІНТЭРВІЮ ЛУКАШЭНКІ WASHINGTON POST — ЧАГО НЕ ЗАЎВАЖЫЛА БЕЛТА

**Дзяржаўнае агенцтва БелТА надрукавала вытрымкі з інтэрвію Аляксандра Лукашэнкі амэрыканскай газэце «Вашынгтон пост». Аналіз двух гэтых тэкстаў -- на «БелТА» і ў «Вашынгтон пост» -- дазваляе адзначыць, што дзяржаўнае агенцтва перадрукавала далёка ня ўсё выказванні кіраўніка дзяржавы, па свойму яго падтасавала.**

Напрыклад, гаворачы пра выказванні кандыдатаў у прэзыдэнты падчас выбарчай кампаніі, Лукашэнка заяўляе: «Пытаньне ў тым, што кандыдаты казалі. Яны казалі, што Лукашэнку трэба павесіць».

Падчас дыялёгу аўтара інтэрвію Лэлі Ўэймэт зь беларускім кіраўніком журналістка пытаецца пра пару зьняволеных, у якіх ёсьць трохгадовы сын. Лукашэнка кажа, што ня ведае такіх выпадкаў, і перапытваецца ў журналісткі, пра каго ідзе размова. Уэймэт адказвае, што пра Халіп і Саньнікава. Лукашэнка на гэта кажа, што праверыць гэтую інфармацыю.

Калі размова заходзіць пра рэгістрацыю грамадзскіх аб'яднаньняў, Лукашэнка заяўляе, што ніякіх праблемаў тут няма.

«Гэта няпраўда. Як наконт Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі?» — пытаецца Уэймэт.

«У Беларусі Хрысьціянская дэмакратыя, можа, ніколі ня будзе зарэгістраваная. Яны ўдзельнічалі ў бунце. Яны не хрысьціянскія дэмакраты, яны бандыты», — адказае Лукашэнка.

Ёсьць яшчэ некалькі момантаў, якія ня трапілі ў варыянт БелТА. На пытаньне «чаму вы выгналі амэрыканскага амбасадара ў 2008 годзе?» Лукашэнка адказвае: «Навошта нам патрэбны амбасадар, які арганізуе дзеяньні пятай калёны?»

І нарэшце, выказванні Лукашэнкі пра прэзыдэнта Грузіі Міхаіла Саакашвілі, аднаго з нямногіх кіраўнікоў дзяржаў, хто павіншаваў Лукашэнку зь «перамогай» пасьля 19 сьнежня. Разьвіваючы тэму пра двайныя стандарты ЗША, Лукашэнка кажа: «Нядаўна ў Грузіі прэзыдэнт Саакашвілі падавіў самым брутальным чынам маніфэстацыю апазыцыі. Але вы працягвае мець справу зь ім? Чаму? Бо Саакашвілі ваш сукін сын».

**Віталь Цыганкоў.**

## НАША ЎЛАДА

# ЛУКАШЭНКАЎЦЫ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ ПА ...

«Наша Ніва» толькі што атрымала з Вярхоўнага Суда статыстыку за 2010 год: было апраўдана 217 чалавек на 61054 асуджаных (0,36%). У дэмакратычных краінах лічба апраўдальных прысудаў складае 10–20%.

Калі людзі ў масках раздзяваюць кандыдатаў у прэзідэнты дагала і ставяць іх на расцяжку пяць разоў за дзень, яны фармальна нічога не парушаюць. Няма ніякай нормы закона, якая б абмяжоўвала лічбу вобшукаў у турэмнай камеры.

Гітлерцы таксама дзейнічалі па законе — па сваім законе.

Абліваў на марозе халоднай вадой генерала Карбышава — за парушэнне лагернага рэжыму.

Арыштоўвалі камуністаў і сацыялістаў — як «дэструктыўных элементаў».

І старшыня КДБ БССР Цанава згодна з законам паслаў элегантную Ларысу Геніюш на 25 гадоў у канцлагеры — на верную смерць.

Праўда, доля распарадзілася інакш: Геніюш праз 8 гадоў з лагера вярнулася ў родны край, а пасадзілі ўжо Цанаву — таксама ў поўнай адпаведнасці з законам.

Кат сам аказаўся не такі трывушчы і сканаў за кратамі.

Законы краіны часам пярэчаць нормам міжнароднага права і агульнапрызнаным уяўленням аб правах чалавека.

Дзеянні па законе, які пярэчыць Канстытуцыі ці неад'емным правам чалавека, могуць цягнуць у далейшым юрыдычную адказнасць.

Як нагадаў нядаўна лідар сацыял-дэмакратаў Анатоль Сідарэвіч, «Энгельс адзначаў: першай умовай захавання законнасці з боку народу з'яўляецца тое, што і органы ўлады трымаюцца ў рамках закону. У адваротным выпадку, пісаў ён, паводле англійскіх прававых паняццяў, паўстанне становіцца першым абавязкам грамадзян».

Наша жыццё фармуе не толькі літара законаў, але і дух дзейных звычаяў.

Лічба, якая найлепш характарызуе рэпрэсіўнасць лукашэнкаўскага рэжыму, — гэта нават не колькасць палітвязняў, а доля апраўдальных прысудаў, якія выносяцца ў краіне.

Паводле звестак Вярхоўнага Суда Беларусі, у 2008 годзе быў апраўданы 191 человек на 68 530 асуджаных (0,28%). У 2009 годзе гэты паказчык склаў 187 апраўданых на 62 064 асуджаных (0,3%). «Наша Ніва» толькі што атрымала з Вярхоўнага Суда статыстыку за 2010 год: было апраўдана 217 чалавек на 61054 асуджаных (0,36%).

Вось што пра гэта піша чалавек, ніяк не звязаны з палітычнай апазіцыяй, — Ігар Лапека, галоўны спецыяліст камісіі палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу па нацыянальнай бяспецы, кандыдат юрыдычных навук:

«Пачынаючы з 60-х гадоў, нягледзячы на ўсе сацыяльныя, эканамічныя, дзяржаўныя змены, змены ў судаводстве і працэсуальным заканадаўстве, доля апраўдальных прысудаў ніколі не перавышала 2% ад усёй масы вынесеных прысудаў. Гэта анамальна нізкі ўзровень, не супастаўны са станам рэчаў ні ў адной з развітых дзяржаў. Яго немагчыма растлумачыць, як часам спрабуюць, нагляднай дзейнасцю пракуратуры, якая не дапускае да перадачы ў суд спраў, якія не ўтрымліваюць дастатковых для асуджэння доказаў вінаватасці. Падобныя, і нават больш жорсткія, фільтры маюцца ва ўсіх прававых сістэмах, аднак адсотак апраўдальных прысудаў там несувымерна вышэйшы (вар'яецца ад 10 да 20% і нават больш)».

Параўнайма гэтыя лічбы: 0,3% у Беларусі і 10–20% у дэмакратычных краінах.

У ліку гэтых дзесяці працэнтаў і 4 гады турмы Атрошчанкаву і Парфянкову за іх палітычны пратэст. У іх ледзьве не трапіў і школьнік Логінаў з Віцебска, на якога хацелі павесіць забойства. Толькі дзякуючы звышнастойлівасці бацькоў, яго справа нядаўна стала паказальным выняткам, які толькі пацвярджае правіла.

Гэта і ёсць кошт дыктатуры і яе псеўдазаконнасці.

Гэта і ёсць рэальная лічба ахвяраў злачыннага рэжыму — 6000–12000 чалавек у год. Людзей, якім ламаюць лёсы, якія выходзяць — калі выходзяць — маральнымі і фізічнымі калекамі, сухотнікамі, рэцыдывістамі.

**Андрэй Дынько, «Наша Ніва».**

# "Расея ўцюхала нам сваю АЭС"

**Радыё Свабода**

**Лідэр руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч назваў заключанае 15 сакавіка пагадненне паміж Менскам і Масквой пра супрацоўніцтва ў справе будаўніцтве АЭС «прыкладам расейскай эканамічнай экспансіі тут і цяпер».**

«Нават фон для падпісання з Расеяй пагаднення пра будаўніцтва АЭС атрымаўся сымбалічна нэгатыўны. Маю на ўвазе падзеі ў Японіі — праблемы там з атамнымі станцыямі. Кажу і як фізік: расейскія тэхналёгіі не параўнаць з заходнімі! Тым больш прапанаваны нам рэактар нідзе ня выпрабаваны».

«Праект АЭС нібыта меў на мэце зьменшыць нашу энэргазалежнасьць ад Масквы. Але павялічае да крытычнага ўзроўню. На дадатак будзем яшчэ і прывязаныя да ўранавага паліва ўсходняй суседкі, бо іхняя станцыя да яго прыстасаваная. Нарэшце, будуем за пазычаныя ў Расеі ж грошы, вялікія грошы. Разьлічвацца — нашым дзецям», — заявіў палітык.

Мілінкевіч нагадаў, што «рашэньне пра зьяўленьне Беларускай АЭС было прынятае без грамадзкага абмеркаваньня, хоць такое пытаньне пасьля Чарнобылю павінна было б вырашацца нават праз рэфэрэндум».

«На жаль, усё болей губляем сувэрэнітэт — энэргетычны, эканамічны, пад сур'ёзнай пагрозай палітычны… Па сутнасьці, Расея нам, як кажуць, уцюхала сваю АЭС, скарыстаўшыся разрывам адносін з Захадам і пагарашэньнем эканамічнага становішча, якое пагражае палітычнай трываласьці рэжыму Лукашэнкі», — лічыць лідэр руху «За свабоду».

## ПРАБЛЕМЫ ЭКАНОМІКІ

# Эксперт: В экономике идет разгон инфляции

СТАВКА РЕФИНАНСИРОВАНИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО БАНКА БЕЛАРУСИ ПОВЫШАЕТСЯ НА 1,5 ПРОЦЕНТНОГО ПУНКТА И С 16 МАРТА СОСТАВИТ 12% ГОДОВЫХ. ПОЧЕМУ ЭТО ПРОИСХОДИТ И КТО ОКАЖЕТСЯ В ВЫИГРЫШЕ, А КТО -- В ПРОИГРЫШЕ ОТ ТАКОГО ШАГА НАЦБАНКА?

Ставка рефинансирования поднимается тогда, когда существует реальная угроза инфляции. Индекс потребительских цен в феврале 2011 года составил 102,7%, что, как отмечается в сообщении на сайте Нацбанка, связано с ростом тарифов на жилищно-коммунальные услуги вследствие увеличения цены покупки природного газа, импортируемого из России, и воздействием увеличения мировых цен на энергоносители и продукты питания.

Экономист **Сергей Чалый** считает повышение ставки рефинансирования последствием «раздачи слонов» в конце прошлого года.

– Вот сейчас мы уже имеем почти половину нормы инфляции на этот год, - подчеркивает экономист Сергей Чалый. – Ставка рефинансирования поднимается, чтобы Нацбанку не приходилось субсидировал кредиторов. Идея такова: сделать менее доступными рублевые ресурсы для заемщиков и, соответственно, более привлекательными рублевые депозиты.

– Деньги при повышении ставки рефинансирования дорожают, и в результате денежная масса в обороте несколько сокращается. Соответственно, уменьшается и инфляция, -- отмечает экономист **Леонид Злотников**. – Хуже от этого будет промышленности. Предприятия и так не очень охотно брали кредиты, поскольку им трудно возвращать. А вот для людей и предприятий, которые теряют на инфляции, меры, сдерживающие ее, в том числе и повышение ставки рефинансирования, только улучшат ситуацию. Потеряют на этом кредиторы, заемщики (субъекты хозяйствования), а население выиграет.

А вот от высокой инфляции, по словам эксперта, выигрывает бюджет, поскольку прибыль предприятий оказывается искусственно завышенной, и налоги тоже.

– Однако у предприятий без оборотных средств, с низкой рентабельностью (а у нас сейчас чуть ли не половина таких) инфляция вымывает средства в пользу бюджета, в пользу государства, -- подчеркивает Леонид Злотников.

О ситуации на промышленных предприятиях в связи с повышением ставки рефинансирования, по мнению Сергея Чалого, сейчас никто особо не думает.

– Это в прошлом году у нас была задача обеспечения экономического роста, вот и получили результат. Сейчас боремся с последствиями, -- считает эксперт. – Полтора процента это не настолько существенное повышение ставки рефинансирования, хотя, в принципе, это вынужденная мера с целью уменьшения денег в экономике, поскольку действительно идет разгон инфляции.

В прошлом году Нацбанк шесть раз снижал ставку рефинансирования на 0,5%. В последний раз – в сентябре 2010 года.

В соответствии с основными направлениями денежно-кредитной политики на 2011 год запланировано снижение ставки рефинансирования к концу года до 8-10% годовых.

**Геннадий КОСАРЕВ.**

## САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

# 42 ГОДА, ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ, ЕСТЬ МУЖ И ДЕТИ…

ЖЕНЩИН В БЕЛАРУСИ БОЛЬШЕ, ЧЕМ МУЖЧИН. ЭТО ВСЕМ ИЗВЕСТНО. НО НЕ ВСЕ ЗНАЮТ, ЧТО В КАТЕГОРИИ ДО «30 ЛЕТ» В НАШЕЙ СТРАНЕ МУЖЧИН БУДЕТ ПОБОЛЬШЕ, ЧЕМ ЖЕНЩИН.

По данным Белстата, возраст средней белоруски – 42 года. Живет она в городе, у нее есть высшее или среднее специальное образование. Средняя белоруска замужем, есть дети.

В целом на 1000 мужчин в нашей стране 1151 женщина. Зато в возрастной категории «25 – 29 лет» на 1000 мужчин приходится 975 женщин.

Если сравнить статистику по областям и столице, минчанкам не позавидуешь. Им тяжелее найти себе пару, чем жительницам района и области. В столице на тысячу мужчин приходится 1177 женщин. А вообще городами невест в нашей стране могут считаться Витебск, Полоцк и Гомель – там на 1000 мужчин приходится около 1240, 1219 и 1203 женщины соответственно.

Причем женщины могут похвастаться крепким здоровьем: живут наши дамы чуть ли не на 12 лет дольше, чем представители сильного пола. В 2009 году ожидаемая продолжительность жизни мужчины была 64,7 года, а женщины – 76,4 года. Ну а что ж вы, мужчины, хотите: дамы ведут более здоровый образ жизни! Чего только стоит такая статистика: курящих мужчин у нас 52%, а курящих женщин – 27%.

**Замуж идут позже, изменяют чаще?**

Может, именно в связи с такой продолжительностью жизни замуж выходить белоруски стали позже. А куда им торопиться? По данным Белстата, если в 2000 году белоруски шли в загс в среднем 22,8 года, то по статистике прошлого года, уже – в 24,4 года. Кстати, сейчас почти каждая четвертая женщина в стране никогда не состояла в браке.

А ведь, как говорят специалисты, с женами белорусам везет как никому! Как рассказал Интерфакс-Запад сексопатолог Дмитрий Капустин, одна из основных проблем наших женщин (для мужчин-то это качество, скорее, достоинство) – это нетребовательность к своим мужьям. Он считает, что в последние десять лет наши женщины проявляют к своим избранникам «излишнюю толерантность». Может, она и излишняя, зато разводов-то меньше!

Правда, как сообщает Интерфакс-Запад, сексопатологи и психологи уверяют, будто наши дамы стали изменять своим мужьям в 3 – 4 раза чаще, чем 10 лет назад. Ну, это ведь еще доказать надо!

**В школах больше мальчиков, а в вузах – девочек**

Чем могут похвастаться белорусские женщины, так это высшим образованием. По данным Белстата, 49% женщин в нашей стране имеют высшее и среднее специальное образование, а вот среди мужчин обладателей дипломов – всего 42%.

В школах, кстати, 51% учеников – мальчики, а вот в вузе девушки – это уже 59% студентов.

Специальности женщины в основном выбирают гуманитарные, социальные и экономические. Правда, зарабатывать они так и не учатся. Как передает Интерфакс-Запад со ссылкой на миссию ООН, зарплата у женщин на 20% ниже, чем у мужчин. Читай: там, где мужчина зарабатывает пять рублей, женщина получает четыре.

**Елена Толкачева, «КП в Беларуси».**

## СВЕТ ПРА БЕЛАРУСЬ

# БРИТАНСКИЕ ЮРИСТЫ ГОТОВЯТСЯ ПРИВЛЕЧЬ ЛУКАШЕНКО К СУДУ

«БРИТАНСКИЕ ЮРИСТЫ ГОТОВЯТСЯ ПРИВЛЕЧЬ БЕЛОРУССКОГО ПРЕЗИДЕНТА К СУДУ» — ТАКИМ ПОДЗАГОЛОВКОМ ОТКРЫВАЕТСЯ СТАТЬЯ НА ПЕРВОЙ ПОЛОСЕ INDEPENDENT.

Издание сообщает, что британская юридическая фирма готовит персональный судебный иск против Александра Лукашенко, обвиняя его в систематическом нарушении прав человека, а именно в том, что заключенных белорусской тюрьмы КГБ регулярно подвергают пыткам, сообщает ВВС.

«Следователи правозащитных организаций опросили сотни активистов, арестованных после прошедших в декабре [в Беларуси] президентских выборов, и обнаружили, что избиения, пытки и нечеловеческие условия содержания до сих пор являются распространенной практикой в стране, где всемогущая тайная полиция по-прежнему носит название КГБ, и которую нередко называют последней диктатурой Европы», - утверждает Independent.

Газета напоминает, что 19 декабря в результате разгона белорусским ОМОНом акции протеста в Минске было задержано по меньшей мере 689 человек. Еще несколько сотен были арестованы позднее.

Правозащитники опросили 205 задержанных, «многие из которых были быстро осуждены без всяких адвокатов и получили короткие сроки». Почти три четверти опрошенных заявили, что в ходе предварительного заключения подвергались избиениям, в том числе 57 человек били резиновыми дубинками.

«Во многих случаях ОМОН избивал задержанных и издевался над ними. Их часами держали на холоде, без еды, без воды, без возможности сходить в туалет, а суды над ними проводили очень быстро, даже не пытаясь создать видимость нормального процесса, - цитирует издание главу российского представительства Human Rights Watch Анну Севортян. - Это была насмешка над правосудием, от начала до конца».

Далее Independent рассказывает историю одной из задержанных, 19-летней Светланы. По ее словам, милиционеры набросились на нее, когда она попросила вызвать адвоката: один заламывал руки, а двое других избивали ногами и дубинками. Протокол задержания ей даже не показали: «Ты все равно его не подпишешь, но это не имеет значения».

«Десяткам оппозиционных политиков, журналистов и демократических активистов по-прежнему угрожает лишение свободы сроком до 15 лет по обвинению в организации массовых беспорядков».

Британская ведущая правозащитная организация H2O Law заявляет, что намерена предъявить Лукашенко персональный иск, если он немедленно не выпустит всех политических заключенных.

Компания представляет интересы семей задержанных. Юристы выражают надежду, что персональный иск против Лукашенко приведет к выдаче ордера на арест белорусского президента или людей из его окружения. Independent напоминает, что Евросоюз уже закрыл свои границы для представителей белорусских властей, однако такой ордер позволил бы распространить этот запрет на все страны, у которых с Британией есть договор о взаимной экстрадиции.

По словам представителя H2O Law, поворотным моментом стали показания бывшего кандидата в президенты Беларуси Алеся Михалевича, который утверждает, что в ходе 10-недельного заключения в КПЗ «Американка» его неоднократно пытали во время допросов.

«Десяткам оппозиционных политиков, журналистов и демократических активистов по-прежнему угрожает лишение свободы сроком до 15 лет по обвинению в организации массовых беспорядков», - подчеркивает издание.

ОБСЕ настолько обеспокоена судьбой этих людей, что намерена послать своих наблюдателей на судебные слушания.

Если H2O выполнит свои угрозы и подаст иск, отмечает издание, это станет первым прецедентом, когда международные правозащитники будут в судебном порядке преследовать действующего лидера независимой страны.

Согласно международному законодательству, напоминает газета, применение пыток является одним из немногочисленных преступлений, на которые не распространяется дипломатический иммунитет главы государства.

**Игорь Залесский, «Народная воля».**

# ЕС ПРЫПЫНЯЕ СУПРАЦУ З УРАДАМ ДА ВЫЗВАЛЕННЯ ВЯЗНЯЎ

***Міністры замежных спраў краін «Вышаградскай групы» — Вугоршчыны, Польшчы, Славаччыны і Чэхіі — а таксама Нямеччыны зрабілі напярэдадні ў Браціславе заяву па Беларусі. Яны заклікалі Аляксандра Лукашэнку вызваліць усіх палітычных вязняў і спыніць пераслед апазіцыі. У адваротным выпадку Менску пагражаюць далейшыя санкцыі.***

Ад Беларусі ў Браціслаўскіх сустрэчах браў удзел лідар Руху за свабоду Аляксандр Мілінкевіч. Ён меў сустрэчу з еўракамісарам па пытаннях краін-суседзяў Штэфанам Фюле. Вось што расказаў Мілінкевіч па выніках сустрэчы:

— Супрацоўніцтва з урадам прыпыняецца да вызвалення вязняў, і акцэнт у супрацы з нашай краінай будзе рабіцца на супрацоўніцтва з грамадствам, перш за ўсё з дэмакратычнай часткай грамадства, з няўрадавымі арганізацыямі, і на падтрымцы вольных СМІ. Пра гэта мы гаварылі з еўракамісарам. Такім чынам, супрацоўніцтва з урадам прыпыняецца і пераносіцца на недзяржаўны сектар. Але гэтыя праекты нялёгка рэалізаваць, бо краіна самаізалюецца.

Мы гаварылі таксама пра тое, што беларускаму народу дорага каштуе захаванне той сістэмы ўлады, якую пабудаваў Лукашэнка. Беларускі народ цярпіць і трэба зрабіць усё, каб ён гэтага не адчуваў. Прапаганда, безумоўна, будзе выкарыстоўваць тое, што ў нас адбылося на выбарах, і сённяшнія суды над палітвязнямі — будуць казаць, што на Захадзе ворагі, а ўнутры краіны іх агенты. Таму мы павінны гэта ўсё разбіваць, бо гэта поўная хлусня, і беларусы павінны ведаць, што ізалюецца не беларускі народ, але ўлада, якая паводзіць сябе неадпаведна нормам жыцця ў Еўропе.

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў
**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы. Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742
**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна